*Ляпешкін Я. М.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*Liapeshkin Y.*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(47+476):35.076«1912/1915»**

# СЛУЖБОВЫЯ ПАЕЗДКІ МІНСКАГА ГУБЕРНАТАРА А. Ф. ГІРСА І ПАРАДАК ЯГО ЗАМЯШЧЭННЯ (1912–1915 гг.)

# OFFICIALS TRIP MINSK GOVERNOR A. F. GIRS AND ORDER HIS REPLACEMENT (1912–1915)

*У артыкуле разгледжана заканадаўства адносна інспектарскіх паездак начальнікаў губерняў і парадку іх замяшчэння. Праведзены аналіз дакументаў афіцыйнага справаводства (Канцылярыі мінскага губернатара А. Ф. Гірса і Мінскага губернскага праўлення) і матэрыялаў перыёдыкі (нумароў газеты «Минские губернские ведомости»), дазволіў адказаць на пытанні, які чыноўнік і як часта замяшчаў губернатара падчас яго камандзіровак. Вызначана колькасць паездак і іх асноўныя напрамкі. Падлічана, колькі дзён адсутнічаў А. Ф. Гірс на кіруючым пасту ў сувязі з адпачынкамі і камандзіроўкамі.*
*Ключавыя словы: Мінская губерня; губернатар; А. Ф. Гірс; службовыя паездкі; чыноўнікі; віцэ-губернатар; кіраўнік мінскай казённай палаты.*

*The article deals with legislation regarding supervisory visits heads of provinces and their replacement order. The analysis of official business documents (Office of Minsk governor A. F. Girs and Minsk provincial government) and the materials of periodicals (newspapers room «Minsk province news»), allowed to answer the questions, which the official and how often substituted for the Governor during his trips. Determined by the number of trips and the main directions. It is estimated the number of days absent A. F. Girs at the helm due to holidays and business trips.*
*Keywords: Minsk Province; governor; A. F. Girs; business travel; officials; Vice-Governor; Head of Minsk Exchequer.*

У айчыннай гістарычнай навуцы даследаванне пытанняў, звязаных з мясцовым кіраваннем, застаецца адным з прыярытэтных напрамкаў, у сувязі з недастатковай вывучанасцю праблемы. Паколькі кіраванне гэта цэлая сістэма, творцамі якой выступалі людзі, варта аналізаваць дзейнасць яе канкрэтных прадстаўнікоў. Таму ў дадзеным артыкуле на аснове аналіза крыніц разгледжаны паездкі як складовая частка кіравання мінскага губернатара А. Ф. Гірса.

Паездкі губернатара і парадак яго замяшчэння вызначала «Агульнае губернскае ўстанаўленне» Звода законаў Расійскай імперыі [1].

Адным са шматлікіх абавязкаў губернатара было правядзенне рэвізіі губерні ў цэлым і павятовых гарадоў у прыватнасці [1, ст. 382]. Пры гэтым начальнік губерні павінен быў спланаваць паездкі для гэтай мэты такім чынам, каб «…не ўдаляцца ад губернскага горада на час занадта працяглы» [1, ст. 382]. У выпадку выяўлення губернатарам падчас праверкі губернскай установы няспраўнасцей, ён прадпісваў іх выправіць [1, ст. 383].

«Скончыўшы рэвізію аднаго павятовага горада і пераязджаючы ў суседні, – прадпісвалася ў заканадаўстве, – губернатар імкнецца размяшчаць свой шлях такім чынам, каб яму можна было, у працяг гэтага, агледзець і бліжэйшыя пазаштатныя гарады і некалькі валасцей, гандлёвых значных паселішчаў, прыстаняў…» [1, ст. 384]. Такім чынам, начальнік губерні, нават пераязджаючы з аднаго павятовага горада ў іншы, павінен быў, не марнуючы час, адначасова правяраць становішча навакольных тэрыторый.

З тым каб не абцяжарваць мясцовых жыхароў падчас аб'езду падначаленай тэрыторыі, губернатар павінен быў імкнуцца выкарыстоўваць паштовых коней [1, ст. 386]. У выпадках, калі ўсё ж выкарыстоўваліся коні тутэйшых насельнікаў, – за гэта прадугледжвалася аплата [1, ст. 386].

Увогуле губернатар абавязаны быў праводзіць рэвізію губерні адзін раз у два гады ці штогод, у залежнасці ад памераў губерні і іншых абставін [1, ст. 388]. Напрыклад, магілёўскі губернатар А. С. Дамбавецкі (1872–1893) ужо ў першыя месяцы пасля свайго прызначэння ў Магілёў пачаў інспектаваць губерню [2, с. 50].

Калі губернатар хварэў, адсутнічаў ці па іншых прычынах не мог выконваць абавязкі, то яго пасада даручалася віцэ-губернатару. У выпадках, калі і ён адсутнічаў ці не мог зрабіць гэтага па пэўных прычынах, кіраўніцтва губерняй ускладалася на кіраўніка казённай палаты альбо начальніка ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў у залежнасці ад старшынства чыноў [1, ст. 267]. Такім чынам, калі губернатар знаходзіўся ў паездцы, яго замяшчалі іншыя вышэйшыя чыноўнікі губерні.

У прыватнасці, падчас адсутнасці мінскага губернатара А. І. Пятрова (1879–1886) кіраўніцтва губерняй перадавалася віцэ-губернатару І. П. Альбядзінскаму або кіраўніку Мінскай казённай палаты Л. А. дэ Ла-Гардзі [3, с. 191–193; 4, с. 244].

Між іншым, калі губернатар пакідаў па справах толькі губернскі горад, застаючыся ў межах губерні, то «…ён не лічыцца адсутным з губерні і не адхіляецца ад удзелу ў справах, асабіста яму даручаных…». Таму чыноўнік, які заступаў на месца губернатара, у сумнеўных выпадках адкладваў справы да вяртання начальніка, альбо адсылаў іх яму для вырашэння [1, ст. 268].

Прапісаны ў заканадаўстве механізм замяшчэння губернатара на практыцы не меў адрознення паміж беларускімі і іншымі губернямі Расійскай імперыі. Напрыклад, падчас службовых паездак томскага губернатара барона К. С. фон Нолькена (1905–1908) абавязкі па кіраванні губерняй ускладаліся на віцэ-губернатара ці кіраўніка казённай палаты [5, с. 170–171]. Таксама кастрамскі губернатар Л. М. Князеў (1902–1905) на працягу 1905 г. тройчы перадаваў кіраванне губерняй віцэ-губернатару Я. Я. Ізвекаву [6, с. 508].

Сярод дакументаў губернскага праўлення захавалася копія нататак губернатара А. Ф. Гірса (1912–1915) ад 17 лістапада 1913 г., з нагоды наведвання ім Баранавічаў Навагрудскага павета. Начальнік губерні ўказваў на неабходнасць стварэння мясцовага «Таварыства добраўпарадкавання»; збора інфармацыі аб патрэбнасці прывядзення ў праезны стан прылеглай дарогі; рэвізіі земскай бальніцы, якая знаходзілася ў нездавальняючым стане, выпрацоўкі праекта пастаяннага штату паліцыі мястэчка і г. д. [7, арк. 84–85]. Гэта запіска сведчыць пра паездку А. Ф. Гірса ў Баранавічы не пазней восені 1913 г. і, адпаведна, пра яго адсутнасць пэўны час у губернскім цэнтры.

Таксама ў мемуарнай літаратуры можна знайсці прыклады ад’ездаў губернатара з губернскага цэнтра. Так, таварыш міністра ўнутраных спраў і камандуючы Асобным корпусам жандараў У. Ф. Джункоўскі (1913–1915), згадваў, што, едучы ў Кішынёў для арганізацыі аховы імператара, па дарозе сустракаўся з губернатарамі, у тым ліку і з мінскім – А. Ф. Гірсам. Пабачыліся яны ў Баранавічах у перыяд паміж 7–10 мая 1914 г. [8, с. 314–315]. Значыць, у гэты час А. Ф. Гірс адсутнічаў у Мінску, і яго павінны былі замяшчаць.

Даходзіла да кур’ёзных выпадкаў. Так, у 1915 г. у Стаўку праз Мінск прыязджаў Мікалай II. Па яго даручэнні ў вагоне цягніка А. Ф. Гірс прадставіў праект арганізацыі дружын з выхаванцаў навучальных устаноў для аказання дапамогі ў сельскагаспадарчых працах тым, хто пазбавіўся працоўнай сілы з-за прызыву ў войска. Імператар ухваліў праект, але затрымаў мінскага губернатара ў вагоне, аж пакуль не прыехалі

ў Баранавічы. Адкуль апошні вярнуўся ў Мінск першым жа цягнікам [9, с. 34–35].

Увогуле кіраўнік Мінскай губерні не затрымліваўся доўга на месцы, часта пакідаў не толькі Мінск, але выязджаў і за межы даручанай яму тэрыторыі.

Аляксей Фёдаравіч Гірс (1871–1958) нарадзіўся ў С.-Пецярбурзе. Паходзіў з дваран, быў праваслаўны. Скончыў Пажскі корпус, з 1891 па 1901 г. служыў у лейб-гвардыі Праабражэнскім палку. З 1901 г. – павятовы прадвадзіцель дваранства ў Ковенскай губерні. Служыў памочнікам граданачальніка Адэсы, эстляндскім віцэ-губернатарам, кіеўскім губернатарам [3, с. 80]. Так выглядала кар'ера А. Ф. Гірса да таго, як трапіць у Мінск.

26 лістапада 1912 г.[1] мінскім губернатарам замест Я. Я. Эрдэлі быў прызначаны камергер імператарскага двара, сапраўдны стацкі саветнік А. Ф. Гірс. [10, с. 3; 3, с. 80]. Перавод не з'яўляўся планавым ці адвольным рашэннем начальства, а быў звязаны з трагічнай падзеяй у Кіеве – забойствам у 1911 г. прэм'ер-міністра П. А. Сталыпіна [4, с. 300]. А. Ф. Гірс не мог гэтага прадухіліць – паказала расследаванне, але яго перавялі, «каб неяк замяць скандальную справу» [4, с. 306]. Праўда, перамяшчэнне адбылося толькі праз год. Былога кіеўскага губернатара хоць і накіравалі ў Мінск, але гэта выглядала, як мяккае пакаранне, бо статус Мінскай губерні быў ніжэйшы.

Трэба адзначыць, што служба ў Кіеве (1909–1912 гг.) не была лёгкай і спакойнай. У гэтым горадзе начальніку губерні прыходзілася нават з дапамогай паліцыі стрымліваць рост коштаў на хлеб. Таксама яму трэба было шукаць шляхі рэгулявання складаных этнаканфесійных узаемаадносін гараджан [4, с. 301–302]. Такім чынам, перад тым, як працягнуць кар'еру ў Мінску, А. Ф. Гірс ужо валодаў непрацяглым, але пэўным досведам губернатарства.

Новапрызначаны чыноўнік уступіў на пасаду 12 снежня 1912 г., аб чым тэлеграмай паведаміў у С.-Пецярбург міністру ўнутраных спраў: «даношу вашаму высокаправасхадзіцельству, што я з гэтага чысла ўступіў у кіраванне найвысачэйша даверанай мне Мінскай губерняй» [11, арк. 13].

Служба А. Ф. Гірса ў Мінску была адносна непрацяглай. Ужо 30 кастрычніка 1915 г. імператарскім указам ён быў пераведзены на па-

[1] Усе даты прыведзены па старым стылі.

саду ніжагародскага губернатара [11, арк. 375]. У сувязі з чым А. Ф. Гірс прасіў мінскага віцэ-губернатара М. А. Астаф'ева, ускладаючы на яго часовае кіраванне губерняй, з 3 лістапада «надалей да перадачы мною губерні новаму мінскаму губернатару, прыняць на сябе працу разглядаць паступаючую на імя губернатара службовую карэспандэнцыю, прымаць даклады па губернскіх установах і канцылярыі губернатара і падпісваць паперы за губернатара. У выпадку сумневаў у накірунку спраў, пачатых мною, будзьце ласкавы, па гэтых справах звяртацца да мяне» [11, арк. 375].

Афіцыйна А. Ф. Гірс з'яўляўся мінскім губернатарам з 26 лістапада 1912 г. па 30 кастрычніка 1915 г. Але фактычна ён кіраваў губерняй з 12 снежня 1912 г. па 3 лістапада 1915 г. Такім чынам, 14 дзён выпадае з яго рэальнай службы ў Мінску. Далей губернатар бываў у адпачынках. У 1913 г. з 10 чэрвеня на два месяцы і ў 1914 г. з 8 па 29 чэрвеня (22 дні), а таксама з 23 снежня 1914 г. па 6 студзеня 1915 г. (14 дзён) [12, арк. 28; 13, арк. 92, 95].

Атрымліваецца яшчэ 96 дзён губернатар адсутнічаў у працоўным кабінеце. Акрамя таго, начальніку губерні не раз даводзілася пакідаць Мінск па справах службы. Уяўленне аб гэтым даюць дадзеныя, прыведзеныя ў табліцы 1.

Згодна выяўленым дакументам, А. Ф. Гірс ажыццявіў 56 службовых паездак (з іх 46 датаваны цалкам) за перыяд з 9 студзеня 1913 г. па 13 верасня 1915 г. Ён знаходзіўся ў адной камандзіроўцы ў сярэднім 5,4 дня і ўвогуле каля 272 дзён (25,8 %)[2] за мінскі перыяд службы ў 1912–1915 гг. Такім чынам, губернатар правёў у паездках і адпачынках за амаль што тры гады прыблізна 368 дзён (35 %)[3].

---

[2] Гэта сярэдняя сума. Колькасць дзён праведзеных у паездках, датаваных цалкам – 245 (па гэтых дадзеных працягласць адной паездкі падлічана, як сярэдняе значэнне – 5,4 д.), а колькасць дзён, праведзеных у паездках, датаваных часткова – 299 д. (да 245 д. дабаўлены дні тых паездак, дзе вядома толькі дата прыезду ці ад'езду, працягласць адной паездкі ў гэтым выпадку лічылася як 5,4 д.).

Разлікі: (245 + 299) ÷ 2 = 272 д. у камандзіроўках. 272 × 100 ÷ 1053 = 25,8 %.

19 дзён за снежань 1912 г. (12.12 – 30.12.1912); 731 д. за 1913–1914 гг. (365,5 × 2); 303 д. за 1915 г. (01.01 – 03.11.1915); 19 + 731 + 303 = 1053 д. за увесь мінскі перыяд.

[3] Разлікі: 272 (д. у камандзіроўках) + 96 (у адпачынках) = 368 д. × 100 ÷ 1053 = = 35 %.

*Табліца 1*

**Службовыя паездкі мінскага губернатара А. Ф. Гірса (9 студзеня 1913 г. – 13 верасня 1915 г.)**

| № | Напрамак | Перыяд (крайнія даты адʼезду і вяртання) | Працягласць (у днях) | Мэта | Чыноўнік, які замяшчаў |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Вільня | 09.01–11.01.1913 | 3 | Кароткачасовая адлучка | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 2 | Мінская губерня | 24.01.1913–* | 5,4 | Па справах службы | – |
| 3 | С.-Пецярбург | 07.02–16.02.1913 | 10 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 4 | С.-Пецярбург | 26.02.1913–* | 5,4 | Удзел у пасяджэнні міжведамаснай Камісіі па пераглядзе ўрачэбна-санітарнага заканадаўства ў Расіі | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 5 | С.-Пецярбург | *–15.03.1913 | 5,4 | Па справах службы | – |
| 6 | С.-Пецярбург | 24.03–06.04.1913 | 13 | Удзел у сесіі Савета па справах мясцовай гаспадаркі | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў, з 30.03 – віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 7 | Бабруйскі пав. | 23.04–28.04.1913 | 6 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 8 | Мазырскі і Рэчыцкі пав. | 28.04–03.05.1913 | 6 | Па справах службы | – |
| 9 | С.-Пецярбург | 14.05–10.06.1913 | 27 | Удзел у пасяджэннях Камісіі па пераглядзе ўрачэбна-санітарнага заканадаўства | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 10 | Слуцкі пав. | 15.08–19.08.1913 | 5 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 11 | Барысаўскі пав. | 29.08–30.08.1913 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |

Заўвагі: * – аўтарам дата не выяўлена.
Скарачэнні: г. (горад); м. (мястэчка); пас. (пасёлак); пав. (павет).

*Працяг табліцы 1*

| № | Напрамак | Перыяд (крайнія даты ад'езду і вяртання) | Працягласць (у днях) | Мэта | Чыноўнік, які замяшчаў |
|---|---|---|---|---|---|
| 12 | Кіеў | 03.09–08.09.1913 | 6 | Удзел ва ўрачыстасці адкрыцця помніка былому старшыні Савета міністраў П. А. Сталыпіну | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 13 | Навагрудскі пав. | 19.09–23.09.1913 | 5 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 14 | С.-Пецярбург | 22.10–05.11.1913 | 14 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 15 | Навагрудскі пав. | 12.11.1913–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 16 | С.-Пецярбург | 30.11–06.12.1913 | 7 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 17 | Мазырскі пав. | 07.01–09.01.1914 | 3 | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 18 | г. Бабруйск | 30.01–31.01.1914 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 19 | Барысаўскі пав. | 03.02.1914–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 20 | г. Пінск | 11.02–13.02.1914 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 21 | С.-Пецярбург | 15.01–28.02.1914 | 14 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 22 | С.-Пецярбург | 05.03–22.03.1914 | 18 | Удзел у пасяджэннях Камісіі па пераглядзе ўрачэбна-санітарнага заканадаўства | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 23 | Слуцкі пав. | 17.04–21.04.1914 | 5 | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 24 | Навагрудскі, Слуцкі і Пінскі пав. | 08.05–10.05.1914 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 25 | Навагрудскі, Слуцкі і Пінскі пав. | 29.05–01.06.1914 | 3 | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 26 | Навагрудскі пав. | 02.06–05.06.1914 | 4 | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |

*Працяг табліцы 1*

| № | Напрамак | Перыяд (крайнія даты ад'езду і вяртання) | Працягласць (у днях) | Мэта | Чыноўнік, які замяшчаў |
|---|---|---|---|---|---|
| 27 | Ігуменскі пав. | 06.07–08.07.1914 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 28 | Барысаўскі, Ігуменскі і Бабруйскі пав. | 14.07.1914–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 29 | г. Барысаў | 04.08–05.08.1914 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 30 | м. Баранавічы | 29.08.1914–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 31 | Навагрудскі пав. | 21.09–22.09.1914 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 32 | м. Баранавічы | 05.10–06.10.1914 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 33 | Мазырскі пав. | 08.10–10.10.1914 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 34 | Навагрудскі пав., м. Баранавічы | 09.11.1914–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 35 | Петраград | 15.11–18.11.1914 | 4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 36 | пас. Лунінец Пінскага пав. | 09.01–11.01.1915 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 37 | м. Баранавічы | 14.01.1915–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 38 | м. Баранавічы | 18.01–20.01.1915 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 39 | м. Баранавічы | 24.01–26.01 2015 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 40 | г. Пінск | 23.02–26.02.1915 | 4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. С. Чаныкаеў |
| 41 | м. Баранавічы | 09.03–11.03.1915 | 3 | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 42 | м. Баранавічы | 28.03–29.03.1915 | 2 | Па справах службы | Начальнік Мінскага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў, І. М. Шэмігонаў |
| 43 | пас. Лунінец Пінскага пав. | 07.04–09.04.1915 | 3 | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |

*Заканчэнне табліцы 1*

| № | Напрамак | Перыяд (крайнія даты адʼезду і вяртання) | Працяглась (у днях) | Мэта | Чыноўнік, які замяшчаў |
|---|---|---|---|---|---|
| 44 | г. Бабруйск і г. Слуцк | 26.04–29.04.1915 | 4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 45 | м. Баранавічы | 04.05–07.05.1915 | 4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 46 | м. Баранавічы, Петраград | 08.05–21.05.1915 | 14 | Па справах службы, адлучка | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў, з 09.05 – віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 47 | м. Стаўбцы, Мінскага пав. | 27.05–28.05.1915 | 2 | Па справах службы | – |
| 48 | г. Барысаў | 08.06–09.06.1915 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 49 | м. Баранавічы | 13.06–14.06.1915 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 50 | г. Рэчыца, м. Лоеў Рэчыцкага пав. | 30.06–04.07.1915 | 5 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 51 | Бабруйскі пав. | 01.07–02.07.1915 | | Па справах службы | Кіраўнік мінскай казённай палаты І. А. Камароў |
| 52 | Пінскі, Мазырскі і Рэчыцкі пав. | 07.07–14.07.1915 | 8 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 53 | м. Баранавічы, вёска Малыя Лукі Навагрудскага пав. | 26.07–28.07.1915 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 54 | Навагрудскі, Слуцкі і Бабруйскі пав. | 02.08–04.08.1915 | 3 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 55 | Навагрудскі і Слуцкі пав. | 16.08.1915–* | 5,4 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |
| 56 | г. Бабруйск | 12.09–13.09.1915 | 2 | Па справах службы | Віцэ-губернатар М. А. Астафʼеў |

Крыніцы: [11, арк. 22, 30, 40 зв., 64–67, 75, 156, 160,]; [12, арк. 28, 88–89, 97, 99, 106, 115, 118, 121, 133, 135, 139, 142, 149, 150, 152, 153, 155, 156, 158, 164, 165, 223, 224, 225]; [13, арк. 1–3, 5, 7, 9 а, 11, 12 а, 14, 18, 20, 25, 28, 32, 35, 38, 39, 40, 43, 51, 54, 56, 59, 64, 68, 71, 72, 75, 79, 77, 81, 85, 86, 87, 89]; [14, арк. 1, 3, 6, 7, 9, 11, 13, 15, 18, 21, 22, 25, 26, 32, 33, 34, 36, 38, 40, 41, 42, 44, 45, 46, 49, 51, 52, 55, 57, 61, 63, 64, 65, 66]; [15, арк. 54, 58, 59]; [16, с. 2]; [17, с. 1]; [18, с. 2]; [19, с. 1]; [20, с. 1]; [21, с. 1]; [22, с. 2]; [23, с. 2]; [24, с. 1]; [25, с. 2]; [26, с. 1].

Пры падліках аўтар прытрымліваўся наступных умоў: узяты перыяд непасрэднага знаходжання на пасадзе: 12 снежня 1912 г. – 3 лістапада 1915 г.; бралася сярэдняя працягласць года, як 365,5 дня і сярэдняя працягласць месяца – 30 дзён; выхадныя і святочныя дні не вылічваліся; дзень адʼезду і прыезду лічыліся як два дні ў паездцы; калі па камандзіроўцы была вядома толькі дата адʼезду ці вяртання – улічвалася сярэдняя працягласць – 5,4 дня. Пры разыходжанні дадзеных па паездках перавага аддавалася архіўнай крыніцы.

Трэба адзначыць, што інфармацыя пра частку паездак не выяўлена аўтарам ці магла ўвогуле не захавацца, таму і агульная сума можа быць большай. Але для рэпрэзентатыўнасці гэтага дастаткова, бо выкарыстаны дакументы, якія адлюстравалі большую частку перыяда, дзе згадваюцца паездкі губернатара; не ўлічаны толькі перыяд з 12 снежня 1912 г. па 9 студзеня 1913 г. і 13 верасня – 30 кастрычніка 1915 г. У сувязі з чым вынікі прыблізныя, але яны паказваюць існаваўшую тэндэнцыю: наколькі часта губернатар пакідаў Мінск і як часта кіраванне пераходзіла да чыноўнікаў, якія яго замяшчалі.

Прыведзеныя дадзеныя дазваляюць зрабіць наступныя высновы:

1) А. Ф. Гірса за адзначаны ў табліцы 1 перыяд падчас камандзіровак на пасадзе губернатара замяшчалі 58 разоў, з іх 54 ідэнтыфікаваны. Віцэ-губернатар замяшчаў 42 разы ці 77,8 % (42 × 100 ÷ 54), кіраўнік Мінскай казённай палаты – 11 разоў ці 20,4 %, (11 × 100 ÷ 54), 1 – начальнік Мінскага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў. Прыярытэтнасць замяшчэння пасады губернатара вызначалася заканадаўчымі актамі і пацвярджалася практыкай: паўнамоцтвы перадаваліся ў першую чаргу віцэ-губернатару, потым кіраўніку казённай палаты альбо начальніку ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў;

2) Начальнік Мінскай губерні ажыццявіў 56 службовых паездак. Найбольш часта губернатар ездзіў у С.-Пецярбург (Петраград) і Баранавічы (11 і 12 разоў адпаведна). І гэта зразумела, бо ў першым пункце знаходзіліся цэнтральныя ўлады, а ў другім у сувязі з пачаткам вайны – Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага.

Частыя адʼезды правіцеляў губерняў з губернскага цэнтра пацвярджаюцца мемуарнымі сведчаннямі. Так, апошні мінскі губернатар У. А. Друцкой-Сакалінскі (1916–1917) сцвярджаў, што губернатар не можа кіраваць, седзячы толькі ў губернскім горадзе. Ён лічыў, што трэба абапірацца на давераных людзей – павятовых прадвадзіцеляў дваранства [27, с. 114]. А для гэтага трэба было перамяшчацца па губерні,

сумяшчаючы патрэбныя візіты з камандзіроўкамі, ізноў жа пакідаючы непасрэднае кіраванне на іншых.

Таксама беларускі даследчык Б. І. Сідарэнка ў сваёй манаграфіі прысвечанай магілёўскаму губернатару А. С. Дамбавецкаму піша наступнае: «Для таго каб ведаць сялянскія запыты, жаданні памешчыкаў, неабходна было, што называецца, бачыць губерню знутры, што было немагчыма з вокнаў губернатарскага кабінета» [2, с. 50].

Такім чынам, А. Ф. Гірс праслужыў у Мінскай губерні амаль тры гады. Але прыблізна чацвёртую частку гэтага тэрміну ён правёў у камандзіроўках, а разам з адпачынкамі каля трэці. Справамі ж губерні ў гэты час займаўся віцэ-губернатар ці кіраўнік казённай палаты. Тым не менш службовыя паездкі губернатара з'яўляліся важнай і неад'емнай часткай яго кіравання.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Свод законов Российской империи: в 16 т. / под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. – Изд. неоффиц. – СПб.: Деятель, 1912. – Т. 2: Свод губернских учреждений. – 737 с.

2. *Сидоренко, Б. И.* Могилевский губернатор Александр Станиславович Дембовецкий и его время / Б. И. Сидоренко. – Могилев: АмелияПринт, 2012. – 250 с.

3. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / Нац. ист. арх. Беларуси; сост. Ю. Н. Снапковский; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: Беларусь, 2016. – 398, [2] с.

4. *Бригадин, П. И.* Минские губернаторы: история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с.

5. *Яковенко, А. В.* Томские губернаторы: биобиблиографический указатель / А. В. Яковенко, В. Д. Гахов. – Томск: Ветер, 2012. – 223 с.

6. *Марасанова, В. М.* История органов губернского управления в конце XVIII – начале XX вв. (на материалах Верхнего Поволжья): дис. ... д-ра. ист. наук: 07.00.02 / В. М. Марасанова. – Ярославль, 2005. – 452 л.: ил. + Прил. (л. 453–783: ил.).

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі г. Мінск (НГАБ у Мінску). – Фонд 299 (Мінскае губернскае праўленне). – Воп. 13. – Спр. 693. – Справа аб павелічэнні штата паліцыі па Мінскай губ. – 08.03.1914 – 26.03.1915.

8. *Джунковский, В. Ф.* Воспоминания: в 2 т. / В. Ф. Джунковский. – Москва: Изд-во им. Сабашниковых, 1997. – Т. 2. – 685, [1] с.

9. *Гирс, А. Ф.* На службе императорской России: (Воспоминания) / А. Ф. Гирс. – Jordanville (N. Y.): Holy Trinity monastery, 1958. – 39 с.

10. Правительственный Вестник. – 1912. – 1 (14) декабря. – № 263.

11. НГАБ у Мінску. – Фонд 295 (Канцылярыя мінскага грамадзянскага губернатара). – Воп. 1. – Спр. 8105. – Справа аб службе мінскага губернатара сапраўднага стацкага саветніка А. Ф. Гірса. – 26.11.1912–08.11.1915.

12. НГАБ у Мінску. – Фонд 299. – Воп. 7. – Спр. 1001. – Справа аб службе мінскага губернатара сапраўднага стацкага саветніка А. Ф. Гірса. – 03.12.1912–18.12.1918.

13. НГАБ у Мінску. – Фонд 299. – Воп. 2. – Спр. 15799. – Рэзалюцыі мінскага губернатара і праўлення аб замяшчэнні начальніка губерні і іншых службовых асоб на час выезду, хваробы і інш. – 08.01.1914 – 08.01.1915.

14. НГАБ у Мінску. – Фонд 299. – Воп. 2. – Спр. 15594. – Перапіска мінскага губернатара з губернскім праўленнем аб раз'ездах яго па справах службы па Мінскай губ. і замене яго на час адсутнасці службовымі асобамі. – 09.01.1913–09.12.1915.

15. НГАБ у Мінску. – Фонд 299. – Воп. 7. – Спр. 530. – Справа аб службе мінскага віцэ-губернатара калежскага саветніка М. А. Астаф'ева. – 17.03.1915 – 14.01.1917.

16. Минские губернские ведомости. – 1913. – 27 февраля. – № 16.

17. Минские губернские ведомости. – 1913. – 20 марта. – № 22.

18. Минские губернские ведомости. – 1913. – 27 марта. – № 24.

19. Минские губернские ведомости. – 1913. – 18 мая. – № 37.

20. Минские губернские ведомости. – 1913. – 4 сентября. – № 68.

21. Минские губернские ведомости. – 1913. – 2 октября. – № 76.

22. Минские губернские ведомости. – 1913. – 26 октября. – № 83.

23. Минские губернские ведомости. – 1913. – 9 ноября. – № 87.

24. Минские губернские ведомости. – 1913. – 4 декабря. – № 94.

25. Минские губернские ведомости. – 1913. – 11 декабря. – № 96.

26. Минские губернские ведомости. – 1914. – 15 ноября. – № 89.

27. *Друцкой-Соколинский, В. А.,* князь. На службе Отечеству. Записки русского губернатора (1914–1918) / В. А. Друцкой-Соколинский. – Орёл: РКФ «3 июля», 1994. – 405 с.

**(Дата паступлення: 25.10.2019).**